УДК 629.735

# Некаторыя метадычныя асаблівасці ў выкладанні гісторыі Беларусі

Мыцько В.Г.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Методыка выкладання курса гісторыі Беларусі прадугледжвае авалоданне студентамі навыкамі параўнальна-гістарычнага аналіза праблем развіцця гісторыі Беларусі ў той ці іншы перыяд. Так, пры разглядзе старажытнага перыяда трэба звярнуць увагу, што заходнееўрапейскае развіццё ішло з апераджальнымі тэмпамі, т.як яно грунтавалася на спадчыне старажытнарымскай імперыі. Адставанне ў развіцці грамадства нашага рэгіена было абумоўлена тым, што ён знаходзіўся па-за межамі гэтай імперыі.

Цікавасць у студэнтаў вызывае параўнальны аналіз асаблівасцей развіцця дзяржаўна-палітычнага ладу ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы другой паловы XV – першай паловы XVI стагоддзя. Жорсткая цэнтралізаваная сістэма кіравання вялікага князя ў Маскоўскай дзяржаве, дзе ўсё рабілася з яго вышэйшага дазволу, у тым ліку і кнігадрукаванне, і адносна дэмакратычнае жыццё ў ВКЛ, дзе ўлада вялікага князя была абмежавана соймам, кнігадрукаванне было справай таго, хто жадаў гэтым займацца (прыклад Ф. Скарыны і інш.)

Гісторыя складаецца з прычынна-выніковых сувязей. Пры разглядзе развіцця буржуазнага ладу на Беларусі трэба адзначыць, што яго кароткі шлях меў гістарычныя абмежаванні – ад адмены прыгоннага права 1861 г. да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. І гэта не дала магчымасці дасягнуць тых дэмакратычных пераўтварэнняў, якія мелі месца ў Заходняй Еўропе.

Трэба адзначыць недахоп сучаснага падыхода да вывучэння гісторыі Беларусі с ужываннем тэстаў, звязаных з датамі. Гісторыя – навука дакладная, але перш за ўсё трэба ўмець аналізаваць сутнасць гістарычнай эвалюцыі, бачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж падзеямі, што немагчыма зрабіць здагадкамі той ці іншай даты. Гісторыя Беларусі павінна даць магчымасць самастойнага мыслення студэнта, адпаведна выхоўваць яго як грамадзяніна і патрыёта Айчыны.